ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

● № 9 (766) ● Пятніца, 13 сакавіка 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

У ПАХОД ЗА ЭКАНОМІЮ

Студэнты другога курса факультэта журналістыкі на камсамольскім сходзе абмеркавалі пісьмо ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб паляпшэнні выкарыстання рэзерваў вытворчасці і узмацненні рэжыму эканоміі у народнай гаспадарцы».

Са зместам пісьма прысутных азнаёміла выкладчык гісторыі рускай журналістыкі Ніна Аляксандрауна Сніцарава.

Затым слова ўзяў студэнт-камуніст Пётр Шыцік. Ён адзначыу, што пісьмо ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ датычыць не толькі рабочых і служачых, але і нас, студэнтаў. Мы павінны эканомна расходаваць электраэнергію, ваду, беражліва адносіцца да падручнікаў і дзяржаўнай маёмасці у аудыторыях і лабараторыях. Карысць ад гэтага будзе значная.

Сакратар камсамольскай арганізацыі курса Віктар Аучарэнка прывёу цікавыя даныя наконт эканоміі, заклікаў будучых журналістаў глыбей пранікаць у сакрэты эканомікі народнай гаспадаркі, яркімі, пераканаучымі фактамі агітаваць за эфектыунае выкарыстанне рэзерваў вытворчасці. А самім таксама даражыць кожнай хвілінай вучэбнага і рабочага часу, прырауняць пропуск заняткаў да прагулу у працы.

Па разглядаемаму пытанню сход прыняу адпаведную пастанову.

Пісьмо ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб паляпшэнні выкарыстання рэзерваў вытворчасці і узмацненні рэжыму эканоміі у народнай гаспадарцы» абмяркоуваецца у калектывах выкладчыкаў і студэнтаў і на іншых факультэтах універсітэта.

Л. ДАЗОРАЎ.

ЦІКАВАСЦЬ ДА ЭКАНАМІЧНАЙ НАВУКІ

Як ужо паведамлялася, на мінулым тыдні адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя. На секцыі палітычнай эканоміі былі зроблены 22 навуковыя даклады. 14 з іх былі прысвечаны вытворчым адносінам сацыялізма, 8 — капіталізму. Тэматыка дакладаў вельмі разнастайная — ад аналізу асобных праблем імперыялізму да праблем дысцыпліны працы, дзейнасці закона вартасці, цэнаўтварэння і значэння тэхнічнага прагрэсу для развіцця сучасных прадукцыйных сіл. У падрыхтоўцы канферэнцыі прынялі шырокі удзел многія вучоныя кафедры. Асабліва плённа папрацаваў дацэнт П. П. Борсук. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана 10 дакладаў.

Вялікую дапамогу студэнтам у падрыхтоўцы навуковых дакладаў аказалі дацэнт В. С. Ямелін, ст. выкладчык Э. В. Шастаковіч.

Многія даклады прыцягнулі ўвагу слухачоў сваім глыбокім зместам, навуковасцю, пастаноўкай актуальных эканамічных праблем. Асабліва спадабаліся даклады студэнтаў Л. Давыдзенка «Навукова-тэхнічны прагрэс і развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы», В. Мархонька «Навуковыя прынцыпы цэнаўтварэння», Т. Цемнянковай «Аб законе вартасці у сацыялістычнай эканоміцы», Л. Лініла «Крытыка антыленінскіх поглядаў на грамадскую ўласнасць і характар працы пры сацыялізме», Г. Шумак «Крытыка тэорый «дэмакратызацыі капіталу» і «народнага капіталізму». Работы гэтых студэнтаў вылучаюцца на рэспубліканскі конкурс.

Вынікі канферэнцыі паказалі вялікую цягу студэнтаў да эканамічных ведаў, вырашэння актуальных праблем эканамічнай навукі, роля якой нязмерна узрастае у грамадскім жыцці і развіцці вытворчых сіл.

Ул. КУЛАЖАНКА, дацэнт.

НАЗНАЧЭННІ АТРЫМАНЫ

Не цярпелася ў апошнія дні філолагам-выпускнікам: надыходзіў час размеркавання. Але сёння ужо ніхто са студэнтаў не хвалюецца: невядомае стала вядомым. Дзяржаўная камісія, якая засядала у ауторак і сераду, вырашыла лес кожнага. Большасць выпускніноў будзе працаваць у школах Валожынскага, Мядзельскага, Пухавіцкага, Ушацкага і іншых раёнаў Беларусі, некаторыя працягнуць вучобу ў аспірантуры.

ПА АКТУАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМАХ

У цяперашні час, як ніколі, узрастае роля грамадскіх навук. Фарміраванне камуністычнага светапогляду, выхаванне новага чалавека, барацьба з буржуазнай ідэалогіяй становяцца усё больш актуальнымі задачамі нашага часу.

Вялікую работу у гэтым напрамку праводзіць кафедра гісторыі філасофіі і логікі. Лічачы першачарговай задачай выхаванне у маладога пакалення марксісцка-ленінскага светапогляду, выкладчыкі кафедры імкнуцца глыбока раскрываць творчы характар марксісцка-ленінскага вучэння, выхоўваюць у студэнтаў непрымірымасць у барацьбе супраць буржуазнай ідэалогіі і перажыткаў мінулага у свядомасці некаторай часткі савецкіх людзей.

Уменне увязаць выкладаемы у лекцыях матэрыял з практыкай камуністычнага будаўніцтва і выкарыстанне фактычнага матэрыялу з жыцця рэспублікі робяць цікавымі і змястоўнымі лекцыі прафесара І. М. Лушчыцкага, дацэнта В. А. Молакава, выкладчыкаў А. А. Круглова, А. Г. Кляцкова і іншых.

На працягу некалькіх год кафедра вядзе навукова-даследчую работу па вывучэнню гісторыка-філасофскай, сацыялагічнай і грамадска-палітычнай думкі у Беларусі. У цяперашні час на аснове ўжо дасягнутых вынікаў з'явілася магчымасць напісаць наступныя манаграфіі: «Нарысы гісторыі філасофіі, сацыялагічнай і грамадска-палітычнай думкі у Беларусі» (дамарксісцкі перыяд) і двухтомнай манаграфіі «Гісторыя марксісцка-ленінскай філасофіі і сацыялогіі у Беларусі». Аўтарскі калектыў у саставе дацэнтаў А. С. Кляучэні, В. А. Молакава, С. Д. Лапцёнка, М. І. Крукоускага, М. І. Іоські, М. В. Рожына, кандыдатаў філасофскіх навук А. А. Круглова, А. Г. Кляцкова, С. К. Малевіча і іншых даследчыкаў узначальвае член-карэспандэнт АН БССР, доктар філасофскіх навук І. М. Лушчыцкі.

Рыхтуючыся да слаўнага юбілею У. І. Леніна, некаторыя выкладчыкі кафедры завяршылі работу над раздзеламі для калектыунай манаграфіі «У. І. Ленін і камуністычнае выхаванне». Так, прафесарам І. М. Лушчыцкім напісан раздзел «У. І. Ленін аб культурна - выхаваўчай функцыі Савецкай дзяржавы», дацэнтам М. І. Крукоускім — «У. І. Ленін і эстэтычнае выхаванне», дацэнтам В. А. Молакавым — «У. І. Ленін і атэістычнае выхаванне», дацэнтам С. Д. Лапцёнкам і в. а. дацэнта М. І. Іоськам—«У. І. Ленін і выхаванне савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму». Акрамя таго, выкладчыкамі і аспірантамі кафедры апублікавана у 1969 годзе па ленінскай тэматыцы адна манаграфія і 12 навуковых артыкулаў. Дзве манаграфіі выйдуць у першым квартале гэтага года.

У снежні 1969 года кафедрай падрыхтавана і праведзена навукова-тэарэтычная канферэнцыя на тэму «Ленінская атэістычная спадчына і сучаснасць». Усяго на канферэнцыі было заслухана і абмеркавана 38 дакладаў. У ёй прынялі удзел 205 чалавек, у тым ліку выкладчыкі ВНУ Масквы, Ленінграда, Кішынёва, а таксама супрацоўнікі навукова-даследчых інстытутаў, настаўнікі школ і тэхнікумаў, работнікі партыйных і дзяржаўных органаў. З цікавымі і змястоўнымі дакладамі на гэтай канферэнцыі выступілі дацэнт В. А. Молакаў і кандыдат філасофскіх навук А. А. Круглоў, аспіранты І. Ф. Рэкуц, М. Д. Аусіевіч і іншыя.

Аспіранты кафедры удзельнічалі таксама у канферэнцыі маладых вучоных, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Тэмы выступленняў будучых вучоных былі прысвечаны у асноўным актуальным пытанням сучаснасці. Гэта характэрна для дакладаў В. Ф. Шалькевіча, Л. Е. Землякова, А. А. Пауловіча і іншых.

Вялікую увагу удзяляе кафедра арганізацыі навукова-даследчай работы сярод студэнтаў. Пры кафедры арганізавапы 4 навуковыя студэпцкія гурткі, у рабоце якіх прымаюць удзел 70 чалавек. Выкладчыкамі кафедры, якія вядуць работу ў студэнцкіх гуртках (В. А. Молакаў, М. В. Рожын, У. Ф. Беркаў), рэкамендавана да агляду студэнцкіх прац, прысвечанаму ленінскаму юбілею, 7 работ.

У многім паспяховым быў для кафедры 1969 год. Тут было падрыхтавана 7 кандыдацкіх дысертацый, 4 з якіх ужо абаронены. Думаецца, што і 1970, ленінскі год, будзе не менш плённым.

А. ВАСІЛЬКОЎ, аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.

На факультэце журналістыкі традыцыйнымі сталі сустрэчы з вопытнымі журналістамі, супрацоўнікамі рэдакцый рэспубліканскіх, абласных і раённых газет.

На гэты раз гасцямі студэнтаў былі ваенныя карэспандэнты з газеты «Во славу Родины». Дасведчаныя журналісты расказалі шмат цікавага і павучальнага са сваёй практыкі.

Фота А. ЛАСМІНСКАГА.

НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ

△ На падрыхтоўчым факультэце адбылася сустрэча в'етнамскіх студэнтаў з ганаровым грамадзянінам беларускай сталіцы, актыўнай удзельніцай падполля у Мінску у гады Вялікай Айчыннай вайны Героем Савецкага Саюза Марыяй Барысаунай Осіпавай, якая расказала замежным сябрам аб барацьбе сваіх таварышаў з нямецка-фашысцкімі акупантамі, аб тым, як у Мінску быў пакараны гітлераўскі стауленік Кубэ.

△ З вялікай цікавасцю пазнаёміліся в'етнамскія студэнты з перадавым прадпрыемствам сталіцы — Мінскім гадзіннікавым заводам.

△ Перад савецкімі і в'етнамскімі студэнтамі, што жывуць у інтэрнаце па вуліцы Бабруйскай выступіў прафесар В. Р. Заурыеу. Ён падзяліўся сваімі ўражаннямі аб знаходжанні у В'етнаме па запрашэнню в'етнамскай акадэміі навук.

△ З лекцыяй «У. І. Ленін — правадыр сусветнага пралетарыяту» на падрыхтоўчым факультэце выступіла дацэнт Т. І. Прытыцкая.

ПАДМУРАК ПОСПЕХУ ЗАКЛАДВАЕЦЦА СЁННЯ

Агульнаўніверсітэцкі сход камсамольскага актыву разгледзеу пытанне аб становішчы і мерах паляпшэння арганізацыйна-масавай работы у камсамольскай арганізацыі універсітэта. У дакладзе, з якім выступіу намеснік сакратара партыйнага камітэта універсітэта **Г. Я. Рылюк,** была адзначана роля, якую адыгрывае камсамольская арганізацыя універсітэта у рашэнні усіх задач падрыхтоукі высококваліфікаваных спецыялістаў.

Цяпер у радах універсітэцкай камсамольскай арганізацыі налічваецца 8900 членаў ВЛКСМ, аб'яднаных у 68 курсавых, 316 групавых і 9 факультэцкіх арганізацый. На камсамольскай рабоце знаходзіцца 34 камуністы. Дакладчык вызначыу чарговыя задачы, на якіх патрэбна сканцэнтраваць увагу. І адна з іх — умелая пастаноўка арганізацыйнай работы, прывіццё студэнтам любві да грамадскай дзейнасці. Добры вопыт тут ёсць. Некалькі год назад з вельмі карыснай ініцыятывай выступіу камітэт камсамола фізічнага факультэта. Усю сваю работу ён будавау пад дэвізам «Нам не патрэбны проста фізікі, нам патрэбны фізікі - марксісты, фізікі, якія займаюцца грамадскай работай». І зараз факультэцкі камітэт камсамола гэтаму пытанню удзяляе вялікую увагу.

Поспех у значнай меры залежыць ад таго, каму даручана весці камсамольскую работу, наколькі правільна улічаны арганізацыйныя здольнасці выбраных камсамольскіх важакоу. У сваю чаргу жыццём даказана, што акуратнае выкананне камсамольскіх даручэнняу цягне за сабой рост актыунасці чалавека, фарміруе патрэбу да грамадскай дзейнасці.

Г. Я. Рылюк расказау аб цікавым эксперыменце, які правёу камітэт камсамола. Былі узяты 3 групы розных факультэтау і розных курсау. Актывісты прааналізавалі удзел кожнага студэнта у грамадскім жыцці на працягу іх вучобы ва універсітэце. Аказалася, што толькі 50 працэнтаў студэнтаў, прычым адны і тыя ж, на працягу усіх год вучобы удзельнічаюць у грамадскім жыцці груп, курса. Яны ж і вучацца, як правіла, на добра і выдатна. А вось другая палова студэнтау — пасіу. Здавалася б, яны павінны лепш вучыцца, бо выкананнем грамадскіх даручэнняу не перагружаны. Аднак атрымліваецца наадварот. Вучацца яны значна горш. Менавіта гэта катэгорыя людзей і стварае, нават садзейнічае стварэнню таго становішча, што ва універсітэце 40 працэнтау троечнікау.

Дакладчык гаворыць і аб правядзенні камсамольскіх сходау, аб падрыхтоуцы да іх. Адзначае недахопы. Практыка і аналіз сходау у групах паказвае, што найбольш актыуна праходзяць яны там, дзе абмяркоуваюцца асабістыя справы студэнтау. Тут звычайна не бывае раунадушных, таму што гаворка ідзе аб лёсе таварыша, члена калектыву. Менавіта таму сходы у групах павінны часцей разглядаць пытанні вучэбнай дысцыпліны, паводзін і культуры студэнтау.

Хвалюючым застаецца пытанне нізкай паспяховасці студэнтаў - першакурснікаў. У апошнюю сесію, напрыклад, у 8, 9, 10 і 11 групах матэматычнага факультэта кожны чацвёрты студэнт атрымау нездавальняючую адзнаку па вышэйшай алгебры.

У цяперашні час задача заключаецца у тым, каб актыуна удзельнічаць у грамадскім жыцці, наладзіць паспяховасць, ліквідаваць запазычанасць.

Няхай сёлетні вучэбны год — год вялікага ленінскага юбілею вызначыцца новымі поспехамі у арганізатарскай, вучэбнай і выхаваучай рабоце.

НЕ ДАРАВАЦЬ ПАРУШЭННЯЎ

(З выступлення В. Емяльяненкава, старшыні камісіі па асабістых справах).

Наша камісія створана у канцы мінулага года. Аднак і за гэты кароткі тэрмін мы набылі пэуны вопыт. Хацелася б падзяліцца думкамі аб рабоце камісіі.

На вялікі жаль, мы яшчэ даволі часта сутыкаемся з выпадкамі страты камсамольскіх дакументаў, з фактамі парушэння дысцыпліны, нядбайных адносін да вучобы. Здараецца часам, што паступіушыя ва універсітэт студэнты не становяцца на камсамольскі улік па 2 гады.

У апошні час на пасяджэннях камісіі разглядаліся справы студэнтау Тарасевіча (філфак), Казлоускага (гістфак), Баброва (фізфак) і іншых. Вельмі часта камісія абмяркоувае паводзіны студэнтау у інтэрнатах, выклікае на пасяджэнні «аматарау падвыпіць».

Іван Казлоускі, напрыклад, з'явіуся у нецвярозым стане на святочную дэманстрацыю. А калі камісія паставіла пытанне аб яго паводзінах, на факультэце заварушылiся, знайшліся абаронцы, пайшлі хадакі. Усе запэунівалі, што ламыліуся хлопец упершыню, выправіцца можа. Мауляу, з кім чаго не здараецца.

Здзіуляе часам бездапаможнасць камсамольскіх груп, якія іншы раз і не абмяркоуваюць парушэнняу дысцыпліны. А калі ужо за такіх нядбайных студэнтау возьмуцца «зверху», тады камсамольскія актывісты замест таго, каб выправіць становішча, ператвараюцца у хадайнікау.

За выпіукай спіртнога засталі у інтэрнаце філолага Тарасевіча. І што ж вы думаеце! Зноу-такі камсамольскае бюро філфака зазваніла ва усе званы. Пачаліся заступніцтва, просьбы, мітусня. Вырашылі разгледзець справу Тарасевіча на бюро камітэта камсамола універсітэта. Запрасілі студэнта. А ён?.. Прыйшоу на пасяджэнне, як кажуць, пад градусам. З такім доўга не важдаліся. Выключылі з радоу ВЛКСМ. Здаецца, зрабілі правільна.

А будучы «вялікі фізік» Баброу спрабаваў прачытаць лекцыю студэнтам замест выкладчыка, упарта прабівауся да кафедры, але... бюро камітэта камсамола вынесла рашэнне: зрабіць строгую вымову з занясеннем у асабістую справу і хадайнічаць перад рэктаратам аб выключэнні Баброва з ліку студэнтау.

Больш патрабавальна трэба адносіцца нашым групкамсоргам і да вядзення дакументацыі, быць прынцыповымі і аб'ектыунымі пры напісанні характарыстык. Менавіта з гэтага нам трэба наводзіць парадак.

Я — ЗА!

(З выступлення студэнта I курса юрфака Р. Янчылі-ка).

Задача камсамольскай арганізацыі 1 курса — згуртаваць людзей, знайсці падыход да кожнага. У гэтае рэчышча і была накіравана асноуная работа камсамольскага бюро курса. Мы стараліся ахапіць усіх студэнтаў грамадскай работай, даць кожнаму камсамольскае даручэнне. Не забывалiся і аб паспяховасці, аб падтрыманні дысцыпліны.

Перад пачаткам экзаменацыйнай сесіі правялі сходы у групах. Запрасілі старшакурснікаў. Яны растлумачылі, на што трэба больш звяртаць увагі пры падрыхтоуцы да экзаменау.

Зараз, калі ужо падведзены вынікі экзаменацыйнай сесіі, можна сказаць, што яны нас радуюць. Прыемна адзначыць таксама, што амаль усе першакурснікі удзельнічаюць у навуковых студэнцкіх гуртках.

Немалаважнае значэнне мае вучоба камсамольскага актыву. Многія групкамсоргі, члены бюро курса былі выбраны упершыню, і яны, шчыра кажучы, не ведалі, з чаго пачынаць. Дапамог факультэцкі камітэт камсамола. Былі арганізаваны семінары з камсоргамі груп.

Мне здаецца, што арганізаваць вучобу актыву неабходна на усіх факультэтах або стварыць агульнаўніверсітэцкі гурток, дзе б займаліся камсамольцы-актывісты.

ДВА ПЫТАННІ

(З выступлення намесніка дэкана хімічнага факультэта В. Ф. Цікавага).

Бывае так, што некаторыя нашы актывісты (а ёсць жа і пасіу) маюць па дзве-тры грамадскія нагрузкі. А ці не здаецца нам часам, што мы перш-наперш перагружаем студэнтау. Было б больш карысці, калі б камсамолец меу адно канкрэтнае даручэнне, а не трычатыры другарадныя. Спашлюся на прыклад. Аляксандр Гучкоу, наш студэнт, меу дзве нязначныя нагрузкі. Акрамя гэтага, іграу яшчэ на баяне. Іграу добра і умела. Таму і даводзілася яму выступаць на факультэцкім аглядзе самадзейнасці, абараняць гонар універсітэта. І сам ён адносіцца якраз да тых, каго мы называем сапраўднымі актывістамі. Сумленна працавау над павышэннем свайго музычнага майстэрства, старанна рыхтаваўся да рэпетыцый, своечасова наведваў іх. Вечар на факультэце — актывіст Гучкоу тут як тут. Сустрэча з першакурснікамі, пасвячэнне іх у студэнты — адзін з арганізатараў мерапрыемства — Гучкоу. Выступае самадзейны калектыу перад замежнымі студэнтамі — і зноу Гучкоу. Словам, стараўся хлопец, як мог. На тое ж ён — актывіст!

Але вось наступіла сесія. Канешне, усё на выдатна Гучкоу здаць не мог: не хапала часу для падрыхтоукі.

І як быць з такімі студэнтамі пры назначэнні стыпендыі?

Я мяркую, што у першую чаргу стыпендыю трэба даваць тым студэнтам, якія штодзень займаюцца грамадскай работай, нават калі у іх залікоуцы і з'явіцца тройка. А гэта, дарэчы сказаць, бывае у актывістау вельмі рэдка.

ХВАЛЮЮ УСІХ

(З выступлення камсорга IV курса аддзялення радыёфізікі П. Юрчанкі).

Пытанне культуры паводзін злабадзённае, яно хвалюе не толькі першакурснікаў, але і усіх студэнтау. Менавіта таму мы і рашылі правесці камсамольскія сходы ва усіх групах факультэта, дзе кожны студэнт, кожны камсамолец мае магчымасць выказаць сваю думку, зрабіць некаторыя вывады, унесці карэктывы. Гэта пытанне абмяркоуваецца з ахвотай.

СТАТУТ ВЛКСМ ПАТРАБУЕ

(З выступлення члена камітэта камсамола Д. Ротмана).

Многія члены ВЛКСМ, лічаць камсамольскія сходы фармальнасцю. А таму з'яуляюцца на іх без дакументау, хоць і добра ведаюць, што камсамольскі білет заўсёды павінен быць з сабой. Да такіх таварышау трэба прад'яуляць павышаныя патрабаванні, бо яны не выконваюць свае абавязкі, забываюць статут ВЛКСМ.

Даволі часта камсоргі, збіраючы узносы, не патрабуюць камсамольскіх білетау для адзнакі аб уплаце, а расліс ваюцца потым адным махам за паугода, а то і за год. Таму вось і атрымліваецца, што камсамольцы губляюць білеты, а камсоргі аб гэтым дазнаюцца толькі праз год.

Камсамольскаму уліку і афармленню дакументацыі трэба удзяліць першачарговую увагу.

АКТЫЎНАСЦЬ — У СПРАВАХ

(З выступлення М. К. Гарбачова, сакратара парткома).

Наш універсітэт, які носіць слаўнае імя Леніна, хутка будзе святкаваць свой паувекавы юбілей. Мы павінны прыкласці шэраг намаганняу, каб з добрымі і радаснымі поспехамі сустрэць гэту цудоуную дату.

Бясспрэчна, многае залежыць ад работы універсітэцкай камсамольскай арганізацыі, ад нашых актывістау. На вас, таварышы, партком, рэктарат, прафесарска-выкладчыцкі састау ускладвае вялікую надзею. Мы мяркуем, што вы, сённяшнія студэнты, а заутра высококваліфікаваныя спецыялісты, будзеце і надалей працягваць грамадскую работу. Тым, хто ужо за студэнцкай партай думае аб гэтым, спадарожнічае поспех. Бо чалавек, заняты грамадскай дзейнасцю, жыве больш напружаным і разам з тым цікавым жыццём.

Нам трэба дабіцца таго, каб кожны студэнт быу ахоплены той ці іншай грамадскай работай. Дзеля гэтага неабходна павысіць баявітасць камсамольскіх арганізацый — групавых, курсавых, факультэцкіх. Бо у нас ва універсітэце яшчэ нямала такіх студэнтау, якія глядзяць на камсамольскую работу здалёк, не уключаюць у дзейнасць камсамола, не цікавяцца грамадскім жыццём свайго курса, групы.

Студэнцтва павінна быць здаровым, актыуным, нераўнадушным, прынцыповым.

НАРОДНЫЯ ДАЗОРНЫЯ

(З выступлення старшыні камітэта народнага кантролю БДУ Я. М. Тагунова).

Адной з важнейшых форм удзелу камсамольцаў у рашэнні задач камуністычнага будаўніцтва з'яуляецца «Камсамольскі пражэктар». «КП» працуе пад кіраўніцтвам мясцовых камсамольскіх органаў, выконвае заданні партыйных арганізацый, органаў народнага кантролю і камітэтаў камсамола.

Нам трэба у самы бліжэйшы час правесці вялікую работу па падбору дастойных кандыдатаў у групы і пасты НК. Ад студэнцтва універсітэта патрэбна будзе вылучыць каля 600 чалавек. Народныя дазорныя будуць сачыць за правільнасцю прадастаулення месц у інтэрнатах, назначэннем і выплатай стыпендый, матэрыяльна-тэхнічнай забяспечанасцю вучэбнага працэсу, станам тэхнікі бяспекі у лабараторыях, а таксама клапаціцца аб бытавым абслугоўванні студэнтау.

Сход камсамольскага актыву прыняў пастанову, у якой, у прыватнасці, гаворыцца:

лічыць важнейшым абавязкам камсамольскай арганізацыі паляпшэнне работы па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб 50-годдзі ВЛКСМ і задачах камуністычнага выхавання моладзі», накіраваць дзейнасць усіх пярвічных арганізацый на свядомае засваенне кожным студэнтам марксісцка-ленінскай тэорыі як асновы падрыхтоукі спецыялістаў высокай кваліфікацыі;

лічыць асноуным абавязкам актыву індывідуальную работу з камсамольцамі у групах;

камітэту камсамола універсітэта, камітэтам камсамола факультэтаў арганізаваць пастаянную вучобу камсамольскага актыву, нізавых камсамольскіх арганізацый формам і метадам камсамольскай работы.

Матэрыялы са сходу падрыхтаваў **В. Свірко.**

НА ЗДЫМКУ: ст. выкладчык Уладзімір Яугеньевіч БАГАМАЗАЎ чытае лекцыю па асновах радыёэлектронікі для студэнтаў другога курса фізічнага факультэта.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

ПРЫЗНАНА ЛЕПШАЙ

Увесь савецкі народ імкнецца сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна працоунымі поспехамі. Студэнты нашага факультэта лепшым падарункам да ленінскага юбілею лічаць выдатную вучобу, актыуны удзел у грамадскім і культурным жыцці. Усе групы уключыліся у спаборніцтва за званне лепшай на факультэце і у конкурс на лепшую акадэмічную групу універсітэта па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі, удзелу у грамадскай, спартыунай і навуковай рабоце. І вось падведзены вынікі. Першая група пятага курса біяфака —адна з лепшых сярод прыродазнаўчых факультэтаў універсітэта. Зараз у ёй шэсць выдатнікаў: Казакевіч, Скачкоў, Цілігузау, Ясінскі, Жарыкау і Жук.

Многія нашы студэнты прымаюць актыуны удзел у грамадскай рабоце. Так, В. Майсеенка на працягу пяці год з'яуляецца старастай групы і курса, два гады выбіраўся у склад прафбюро факультэта; С. Кручкоускі доўгі час быу праформам групы, апошнія два гады ўзначальвае жыллёва-бытавую камісію прафбюро факультэта.

У групе добра наладжана навуковая работа: 13 чалавек падалі свае работы на рэспубліканскі агляд студэнцкіх навуковых прац. Работы 5 студэнтау прызнаны лепшымі і аднесены да першай катэгорыі, а работы 8 студэнтау — да другой катэгорыі.

У групе ёсць шмат спартсменау, якія не раз абаранялі гонар нашага факультэта і універсітэта па розных відах спорту. Напрыклад, Д. Нартовіч доўгі час быу членам зборнай каманды універсітэта па футболу, А. Зянько — па настольнаму тэнісу. О. Казакевіч, В. Вежнавец, М. Баброу, І. Мохарау і іншыя уваходзілі у зборныя каманды факультэта па лёгкай атлетыцы, лыжах, стральбе, шахматах, баскетболу і заусёды займалі прызавыя месцы у спаборніцтвах.

Ідуць апошнія дні нашай вучобы ва універсітэце. І правядзем мы іх так, каб у выкладчыкау засталіся аб нас толькі добрыя успаміны.

А. ЖУК,
старшыня прафбюро біяфака.

НЕ ЧАКАЮЧЫ СПАДАРОЖНАГА ВЕТРУ

Запоуненая пяшчотным светам вясны аудыторыя біяфака. Ад яго становяцца матава-залатымі белыя халаты студэнтау, больш мяккімі, прывабнымі засяроджаныя твары. Ідзе чарговае пасяджэнне гуртка кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл. На павестцы дня — даклад студэнткі другога курса Т. Рэмізавай «Почырк і асоба».

Жыва, з агеньчыкам расказвае Тамара аб графалогіі — навуцы, якая вывучае почырк з пункту гледжання сувязі яго з характарам чалавека. Графолагі улічваюць выразнасць шрыфту і размеры яго, націск і інтэрвалы паміж радкамі, будову кожнай буквы і асобных яе элементау і многае іншае. Большасць даследчыкау почыркау лічыць, што выцягнутыя уверх радкі абазначаюць упэуненасць у сваіх сілах, славалюбства і г. д., радкі, які спускаюцца уніз, характэрны для людзей, што знаходзяцца у прыгнечаным стане. Суцэльная звязанасць літар у словах звычайна сустракаецца у людзей інтэлектуальнай працы, са здольнасцямі да строга лагічнага мыслення. і, наадварот, нязвязанасць літар з'яуляецца тыповай для летуценнікау, мастацкі таленавітых...

Дакладчык расказвае пра волыты урачоу, псіхолагау, зачытвае цікавыя дакументы — радкі, узятыя з работ вядомых графолагау, якія даюць ацэнку почыркам палітычных дзеячоу, вядомых пісьменнікау.

У ходзе даклада пры дапамозе эпідыяскопа ілюструюцца доследы, іх вынікі. А пасля — бурная дыскусія.

Графалогія — навука з мноствам «белых плям», і, магчыма, хто-небудзь са студэнтау, якія так горача выказалі цяпер сваё меркаванне аб прыведзеных фактах, і зоймецца гэтай цікавай навукай веку.

Гледзячы на зацікауленыя твары студэнтау, я падумала, што прычына гэтага не толькі у тэме даклада, добраи падрыхтоуцы да выступлення, але і іншае.

Вось ужо 12 год кіруе гуртком Б. Ф. Осіпау — дацэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл. Захапленне спецыяльнасцю? Несумненна. І яшчэ — вялікае жаданне і уменне прывучыць студэнтау самастойна аналізаваць, супастауляць, тэарэтычна абгрунтоуваць розныя навуковыя пытанні.

Аб папулярнасці гуртка ва універсітэце гаворыць тое, што на пасяджэннях яго часта прысутнічаюць студэнты іншых факультэтау. А вось і яшчэ факты: у 1969 г. на рэспубліканскі агляд навуковых студэнцкіх прац усімі кафедрамі біяфака было прадстаулена 45 работ, пятнаццаць з іх — кафедрай фізіялогіі чалавека і жывёл. Амаль усе работы удастоены вышэйшых катэгорый, а іх аутары узнагароджаны дыпломамі. Работы уяуляюць сабой навуковую каштоунасць: у іх асветлены новыя пытанні, устаноулены новыя факты, якім дадзена тэарэтычнае абгрунтаванне. Яны будуць апублікаваны у навуковым друку.

У гэтым годзе гуртку спаўняецца 20 год. Заснаван ён у 1950 г. прафесарам Г. С. Юньевым. Многае зроблена гурткоуцамі, вялікая работа яшчэ наперадзе. І хочацца спадзявацца, што інтарэс, захапленне выбранай прафесіяй цяперашнія маладыя даследчыкі захаваюць на усё жыццё. Успамінаюцца словы вялікага педагога Ушынскага: «Калі вы удачна выбераце працу і зможаце укласці у яе усю сваю душу, то шчасце само вас адшукае!»

Дабівайцеся ж свайго шчасця, не чакаючы спадарожнага ветру!

Н. МАРАДУДЗІНА,
студэнтка журфака.



Сапрауды, нездарма называюць хімію чараўніцай. Яе цуды можна убачыць нават на лекцыі. Вось чаму такія уважлівыя твары у в'етнамскіх студэнтау на занятках па хіміі, якія вядзе выкладчык падрыхтоучага факультэта Надзежда Гаурылаўна Чумакова.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

АБ ЧЫМ НЕ БЫЛО ГАВОРКІ

НАТАТКІ СА СХОДУ

На парадку дня сходу адміністрацыйна - гаспадарчых работнікаў універсітэта стаяла своечасова ўзнятае пытанне аб выкананні сацыялістычных абавязацельстваў у гонар юбілею У. І. Леніна. Дакладчык камуніст Кірсанаў зрабіў агляд дзейнасці абслугоуваючага персаналу, ад якога ў значнай меры залежаць нармальнае цячэнне навучальнага працэсу і асабліва бытавыя умовы студэнтаў.

Адзначалася праца калектыву бібліятэкі, дзе, акрамя пастаяннай высокай культуры абслугоўвання чытачоу, вядзецца карпатлівая праца па прапагандзе ленінскіх твораў. Не менш старанна працуе калектыў бухгалтэрыі.

Сход спыніў сваю ўвагу і на разборы шматлікіх недахопаў. Выказаны былі папрокі ў адрас прафсаюзнага бюро. Так, да гэтага часу фактычна не падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшы інтэрнат. І справа спынілася толькі з-за таго, што няма каму купіць прызы. Сходу прыйшлося запісаць гэта ў сваю пастанову.

Вельмі слушна выказаўся старшыня прафбюро адміністрацыйнай часткі Г. А. Мужычэнка. Ён давёў сходу, што ў рэктараце працуе шмат людзей з ліку абслугоўваючага персаналу. З чым яны ідуць насустрач усенароднаму святу? Аказалася, што гэтая катэгорыя супрацоўнікаў проста выключана з падрыхтоўкі. Ні аб паляпшэнні абслугоўвання, ні аб павышэнні ідэйна-палітычнага ўзроўню гаварыць нельга: гэтыя пытанні выпалі з іх поля зроку. Асноўную долю віны сход усклаў на начальнікаў аддзелаў, і гэта таксама было адзначана ў пастанове.

Аднадушным з'явілася меркаванне, што каменданты інтэрнатаў працуюць слаба. Часта здараецца, што пакоі агульнага карыстання не адпавядаюць сваёй ролі, дрэнна абсталяваны. Дарэчы, на сходзе амаль нічога не было сказана аб ходзе рамонту вучэбных карпусоу, а тым больш інтэрнатау, які разгорнут у самы адказны час вучэбнага года.

Камуніст Ажыгін, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы ў сваім выступленні адзначыу, што да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна інтэрнат № 4 стане адным з лепшых у бытавых умовах. Адкрыюцца цырульня, майстэрні (тут працавала раней шавецкая, а цяпер закрыта), будуць абсталяваны месцы агульнага карыстання: кухні, сушылкі, пральні, бытавыя пакоі і г. д. На жаль, ні слова не было сказана аб тым, як марудна ідзе рамонт, які страшэнны бруд разведзен на паверхах і ў пакоях і пазбавіцца ад якога няма ніякай магчымасці; які холад ідзе з вокнаў, адкрытых у калідорах насцеж, што на працягу ўсяго вучэбнага года па восем чалавек у пакоі жывуць аспіранты... Ды і ці можна паверыць, што за кароткі час можна закончыць рамонт такімі слабымі тэмпамі. Работы ідуць яшчэ на трэцім паверсе.

Безумоўна, гаспадарчых работнікаў такое становішча хвалюе ў большай ступені, чым аб гэтым гаварылася на сходзе. І выпадак рамонту «з верасня», як адзначыла ў сваім выступленні работніца інтэрната № 4 Казялкова, з'яуляецца выключным. «Мы імкнемся, — шчыра гаварыла яна, — зрабіць усё магчымае, каб наш інтэрнат не скланялі ўсюды. Але што зробіш, калі ён, як нейкая перавалачная база. Хто толькі там не жыве! Адкуль хто ні едзе—усе на Паркавую: спартсмены, настаунікі, людзі розных прафесій...

Яшчэ адна заўвага. Паколькі выносілася пытанне, якое датычылася ўсяго калектыву адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, партыйнае бюро вырашыла правесці адкрыты сход. Але добрая задума не здзейснілася. Людзей сабралася вельмі мала, і горш таго — не прысутнічалі каменданты інтэрнатаў, аб дзейнасці якіх шмат гаварылася. Здаецца, і апошнім было б чым падзяліцца.

Сход паказаў, што камуністам адміністрацыйна-гаспадарчай часткі трэба яшчэ многае зрабіць для паляпшэння быту студэнтаў.

А. СЛУКА.

САМАЦВЕТАЎ РОССЫПЫ

АУДЫТОРЫЯ ПОЎНІЦА галасамі. Як веснавыя раўчукі, сцякаюцца сюды студэнты. Пераважна дзяўчаты. Прыносяць у вачах промні сонца, задорнае харство і свежасць. Адны заклапочана займаюць свае месцы, разгортваюць кнігі, іншыя перакідваюцца словамі. У іх паводзінах сканцэнтраванасць, нецярплівасць — яуная прыкмета семінара. Перад лекцыяй студэнты больш бестурботныя. Але і зараз не адчуваецца насцярожанасці. Той-сёй таропка зірне на гадзіннік, чакае званка. Здаецца, празвіпіць ён — і пачнецца жаданая праца.

Так яно і ёсць. Варта было зайсці выкладчыку беларускай літаратуры Вячаславу Пятровічу Рагойшу, прыветна усміхнуцца, абвясціць тэму заняткаў, як усё становіцца на сваё месца. Тут вырашаецца галоунае, што хвалюе і цікавіць будучых філолагау. Гэта жаданне пазнаць слова, уменне ім карыстацца і спрооа разабрацца у складанай гаме чалавечых пачуццяу. І выкладчык для іх — аутарытэт. Бездакорнае валоданне мовай, лагічная развага — усё так проста, непасрэдна і шчыра. Хіоа не марыць аб гэтым кожны з іх? Большасць прысутных — члены літаратуразнаучага гуртка, які вядзе на трэцім курсе беларускага аддзялення філфака Вячаслау Пятровіч.

В. П. Рагойша гаворыць мала, дае волю мніцыятыве даследчыкау. Студэнты чытаюць даклады, выказваюць свае меркаванні. Вячаслау Пятровіч толькі скіроувае іх думкі, уносіць карэктывы, тлумачыць.

Ідзе спецсеминар па праблеме вершаскладання. Антон Габрыэлян падрыхтаваў даклад аб армянскай паэзіі. Вельмі прачула расказвае ён аб мінулым свайго народа і яго творчасці, прыгадвае напамяць радкі Туманяна, Прусава, Шыраза і іншых паэтаў Арменіі. Разбірае архітэктоніку армянскіх вершаў, робіць аналіз. Яго слухаюць уважліва. Вабіць і падкупляе заузятая шчырасць.

— Я упершыню слухала выступленне аб армянскай паэзіі. І ведаеце: у захапленні, — дзеліцца уражаннямі Таня Менюк.

Свае меркаванні аб праслуханым дакладзе выказваюць Анатоль Верабей і Соф'я Саламевіч.

Вячаслау Пятровіч падводзіць вынікі: удакладняе асобныя месцы з даклада, знаходзіць агульнае, праводзіць паралель у развіцці армянскай і беларускай паэзіі.

І вось слова мае Валянціна Бабіч. Свой даклад яна прысвячае 50-годдзю нашага універсітэта. Праглдзеушы шмат архіуных матэрыялау, Валянціна знаёміць сваіх аднакурснікаў з жыццём і творчасцю Васіля Каваля, Алеся Пальчэускага і Сымона Баранавых, якія вучыліся раней у БДУ. Зараз кожны бацца прапусціць хоць слова. А Валя умее падбіраць факты, умее падаць іх слухачам. Гаворыць з натхненнем, пераканауча і гэтым захоплівае слухача.

Можна спадзявацца, што з гэтых студэнтаў выйдуць добрыя настаунікі і даследчыкі. Сваю прагнасць да ведау, любоу да народнай мудрасці, да мастацкага слова яны перададуць іншым, сваім вучням.

Л. ПЕТЭРСОН.

НОВЫЯ ПАСТУПЛЕННІ У БІБЛІЯТЭКУ

Дышлевый, П. С. В. И. Ленин и философские проблемы релятивистской физики. Киев, «Наукова думка», 1969. 367 стр.

Ермаков, Т. А. Жизнь и деятельность В. И. Ленина — пример беззаветного служения народу. Тюмень, 1969. 26 стр.

Ирошников, М. П. В. И. Ленин и первые декреты Советской власти. Л., 1969. 23 стр.

Карпиленко, С. Т. и Краснов, А. Е. Работа В. И. Ленина «Очередные задачи Советской власти». [Учебн. пособие для студентов-заочников]. Л., 1969. 30 стр.

Клебанов, А. Т. В. И. Ленин — самый человечный человек. Л., 1969. 20 стр.

Кржижановский, Г. М. Мыслитель и революционер. [В. И. Ленин и плановая работа]. М., Политиздат, 1969. 40 стр.

Крывелев, И. А. Атеистические заветы В. И. Ленина. М., «Моск. рабочий», 1969. 88 стр.

Да 50-годдзя універсітэта

СЯБРОЎСКАЯ ДАПАМОГА

Пасля вызвалення Савецкай Беларусі ад інтэрвентаў мінская камісія, якую па-ранейшаму узначальваў акадэмік Я. Ф. Карскі, аднавіла работу па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Урад РСФСР, адзначыўшы, што пастанова ЦВК БССР ад 25 лютага 1919 г. аб адкрыцці універсітэта у Мінску захоўвае сваю сілу як дэкрэт суверэннай Савецкай дзяржавы, абавязаўся аказаць усебаковую дапамогу у стварэнні першай вышэйшай навучальнай установы нашай рэспублікі.

У састаў камісіі садзейнічання арганізацыі Беларускага універсітэта, створанай пры народным камісарыяце асветы РСФСР, увайшлі вядомыя вучоныя: гісторыкі прафесары В. П. Волгін, У. І. Пічэта, біёлаг прафесар Д. М. Пранішнікаў, этнограф прафесар М. А. Янчук, медыкі прафесары Л. С. Мінор і М. Б. Кроль, хімік А. М. Беркенгейм, а таксама іншыя выдатныя спецыялісты. Вялікую увагу Беларускаму універсітэту удзялялі народны камісар асветы РСФСР А. В. Луначарскі і яго намеснік прафесар М. М. Пакроўскі.

Маскоўская камісія выканала вялікую работу па складанню праграм і вучэбных планаў, па падбору выкладчыцкага саставу з ліку вядомых вучоных

27 снежня 1920 г. група членаў маскоўскай камісіі прыбыла у Мінск. Азнаёміўшыся з мясцовымі ўмовамі, з дзейнасцю мінскай камісіі, аказаўшы ёй канкрэтную дапамогу, маскоўскія вучоныя адзначылі поўную магчымасць адкрыць Беларускі дзяржаўны універсітэт у 1921 г.

Цэнтральнае Бюро КП(б)Б і урад БССР прызналі работу па стварэнню Беларускага універсітэта першачарговай, неадкладнай. Таму пры ЦВК БССР была створана аператыўная група з 5 чалавек, якая узначаліла усю арганізацыйную работу у Мінску. Адначасова з ёй сумесным рашэннем Савета Народных Камісараў БССР і народнага камісарыята асветы РСФСР была ўтворана у Маскве на правах часовага праўлення універсітэта група з трох чалавек. Гэту групу узначаліў прафесар У. І. Пічэта, назначаны рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Да лета 1921 г. работа па стварэнню першай вышэйшай навучальнай установы Савецкай Беларусі уступіла ў заключны этап.

НА ЗДЫМКУ: маскоўская і мінская камісіі па арганізацыі БДУ. Мінск, снежань 1920 г. (У першым радзе трэці справа — У. І. Пічэта).

Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.

КНІГА ПРА САРАТНІКА ЛЕНІНА

РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ, педагагічная, літаратурна-публіцыстычная і грамадская дзейнасць П. М. Лепяшынскага доўгі час не знаходзіла у нашай літаратуры дастатковага навуковага асвятлення. Толькі час ад часу паяўляліся асобныя артыкулы, выступленні аб ім у газетах, часопісах. Але яны, вядома, не маглі даць чытачу поўнага і шырокага уяўлення пра нашага слаўнага земляка.

У 1963 годзе ў выдавецтве «Беларусь» выйшла у свет кніга Р. В. Булацкага «Ленінскай гвардыі салдат», у якой упершыню аўтар зрабіў спробу усебакова асвятліць рэвалюцыйную, публіцыстычную, грамадскую, педагагічную і навуковую дзейнасць П. М. Лепяшынскага. Праз пяць год выйшла з друку другая кніга «Зброяй слова», прысвечаная аналізу журналісцкай і публіцыстычнай дзейнасці Панцеляймона Мікалаевіча.

Нядаўна на паліцах кнігарань паявілася другое выданне манаграфіі «Ленінскай гвардыі салдат», дапоўненае і перапрацаванае. Кніга сведчыць пра тое, што Р. В. Булацкі за сем гадоў, прайшоўшых пасля выхаду першай кнігі, зрабіў многае па далейшаму вывучэнню, падбору і сістэматызацыі матэрыялу пра саратніка Леніна. У манаграфіі дадаткова выкарыстан шэраг архіўных фондаў Масквы, Мінска, Магілёва, мемуарная літаратура. У выніку паездак у Літвінавічы, Карму даследчыку удалося пагаварыць з многімі людзьмі якія добра ведалі Лепяшынскага.

Значна шырэй і глыбей, чым у першым выданні кнігі, паказана дзейнасць Лепяшынскага як агента «Искры», як аднаго з арганізатараў камітэта па скліканню II з'езда РСДРП.

У першым выданні кнігі даследчык пісаў, што яму «не удалося знайсці матэрыялы аб рабоце Панцеляймона Мікалаевіча у Екацярынаслаўлі» вясной 1905 года. У новым выданні паказана барацьба П. М. Лепяшынскага, Г. І. Пятроўскага, Б. М. Воліна, І. Е. Захарчанка і іншых ленінцаў з акапаўшыміся ў Екацярынаслаўскім камітэце партыі меншавікамі, тая велізарная работа, якую яны правялі ў цяжкіх умовах сярод рабочых.

Жыццё і дзейнасць П. М. Лепяшынскага у перыяд першай рускай рэвалюцыі, сталыпінскай рэакцыі, падрыхтоўкі і правядзення Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у першыя гады Савецкай улады і грамадзянскай вайны звязаны непасрэдна з Беларуссю. У кнізе на шырокім гістарычным фоне даследчыкам паказана рэвалюцыйная дзейнасць Лепяшынскага ў Оршы ў перыяд пасля паражэння першай рускай рэвалюцыі, а таксама напярэдадні кастрычніцкага узброенага паўстання. У выключна цяжкіх і складаных умовах верхаводства эсэраў, бундаўцаў і меншавікоў у Аршанскім Савеце П. М. Лепяшынскі, узначаліўшы невялікую групу бальшавікоў, змагаўся за ператварэнне у жыццё ленінскага курса.

З цікавасцю пазнаёміцца чытач з тым, як у першыя дні перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі П. М. Лепяшынскі разам з невялікай групай яго таварышаў правёў вялікую работу па затрымцы і распрапагандаванню контррэвалюцыйных войск, якія рухаліся праз Оршу на Петраград для падаўлення рэвалюцыі.

У першым выданні кнігі аўтару не удалося з-за адсутнасці матэрыялу паказаць дзейнасць Лепяшынскага у барацьбе за будаўніцтва новай школы у Туркестане. У другім выданні даследчык падрабязна праследуе тую велізарную работу, якую праводзіў Лепяшынскі, будучы намеснікам старшыні Наркамата адукацыі Туркестана, як, кіруючыся марксісцка-ленінскай тэорыяй у нацыянальным пытанні, дапамог унесці яснасць у тэарэтычную спрэчку пра канкрэтныя шляхі і формы нацыянальнага самавызначэння узбекскага і іншых народаў Сярэдняй Азіі пасля перамогі дыктатуры пралетарыяту.

У 1921 годзе па рашэнню ЦК РКП(б) П. М. Лепяшынскі пераходзіць на работу у толькі што арганізаваны інстытут гісторыі партыі. З кнігі відаць, якую велізарную работу прарабіў тут Панцеляймон Мікалаевіч па збору ленінскіх прац і дакументаў, архіўных і кніжных фондаў. Падрабязна аналізуе аўтар манаграфіі многія навуковыя працы Лепяшынскага па гісторыі партыі.

Адначасова даследчык шмат увагі ўдзяляе Лепяшынскаму як гісторыку сучаснасці. Ён падрабязна расказвае пра яго журналісцкую і публіцыстычную дзейнасць, пра удзел Панцеляймона Мікалаевіча Лепяшынскага у многіх часопісах і газетах. Кніга дае магчымасць пазнаёміцца з Лепяшынскім і як таленавітым публіцыстам, журналістам.

З сімпатыяй выводзіць даследчык вобраз выдатнага нашага земляка, раскрывае яго выключную сціпласць і працалюбства, адданасць справе Леніна.

Жыццё і дзейнасць, барацьба і творчасць П. М. Лепяшынскага — прыклад беззаветнага служэння бессмяротным ідэям марксізма-ленінізма. Пра гэтае жыццё павінны добра ведаць усе савецкія людзі, асабліва наша моладзь.

І. САЧАНКА.

ТУТ АЖЫВАЕ ГІСТОРЫЯ

КОЖНАГА, хто упершыню трапляе на пяты паверх галоўнага корпуса універсітэта, здзіўляе мноства скульптур, размешчаных уздоўж калідора. У глыбіні яго ёсць дзверы з шыльдай «Гістарычны музей».

Давайце зойдзем сюды, пазнаёмімся з дырэктарам музея Л. Ц. Мірончыкавым, паслухаем, што ён раскажа.

— Музей заснаван у 1926 годзе прафесарам М. М. Нікольскім з дапамогай лабаранта Шаўчэнкі. Спачатку гэта быў музей гісторыі рэлігіі і атэізму. Ён знаходзіўся у невялікім памяшканні, дзе былі сабраны матэрыялы па рэлігіі народаў Усходу і антычнасці. З 1938 года музей выходзіць за межы атэістычнага і носіць цяпер ужо назву гісторыка - археалагічнага.

У гады акупацыі музей быў разграблены фашыстамі.

Пры гэтых словах твар Леаніда Цітавіча хмурнее, на лбе збягаюцца маршчынкі. Відаць, нялёгка яму успамінаць тыя цяжкія гады, якія прынеслі усім столькі гора і пакут.

— Але усё ж частку экспанатаў удалося выратаваць.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны музей быў адноўлены, адкрыты новыя аддзелы: антычнасці, нумізматыкі, беларускай этнаграфіі, археалогіі і гісторыі старажытнага Усходу.

Цяпер у музеі пяць аддзелаў, якія кожны год папаўняюцца за лік экспанатаў, здабытых у час студэнцкай практыкі і археалагічных раскопак. Нельга абыякава прайсці міма хоць бы аднаго з іх. Напрыклад, у аддзеле старажытнага Усходу ёсць многа копій прадметаў і арыгіналаў з егіпецкіх грабніц (фрагменты мумій) і фатаграфіі па матэрыяльнай культуры.

Аддзел археалогіі ілюструе гісторыю старажытнай і дарэвалюцыйнай Беларусі. Знаёмячыся з матэрыяламі, можна уявіць сабе жыццё нашых продкаў, іх заняткі, культуру. Бачна жывая душа беларуса, яго імкненні, надзеі.

У аддзеле антычнасці прыцягваюць увагу дэталі старажытнага храма. Леанід Цітавіч расказаў нам, што гэтыя экспанаты былі знойдзены вучоным Бяловым пры раскопках Херсанеса-Таурычаскага і прывезены сюды з Адэсы. Хаця яны былі знойдзены сярод матэрыялаў сярэдневяковага паходжання, але некалькі дэталей сведчаць аб больш раннім іх паходжанні. У высвятленне гэтага вялікі уклад унеслі студэнты гістарычнага факультэта пад кіраўніцтвам прафесара Ф. М. Нячая.

Бадай, самым цікавым з'яўляецца аддзел нумізматыкі. Тут знаходзяцца арыгінальныя манеты з серабра эпохі антычнасці і сярэдневякоўя краін Заходняй Еўропы і старажытнага Усходу. Гэты аддзел заснаван на асабістай калекцыі выкладчыка В. Н. Рабцэвіча, які падарыў музею больш трох тысяч манет.

Цікавая гісторыя у гэтых, не прыцягваючых адразу увагі медных манет. Яны (налічваецца больш 200) былі знойдзены пры разборы старой царквы. Загорнутыя у набожнік, манеты захоўваліся у сялянскім сіце пад алтаром. Мабыць, поп вырашыў прысвоіць увесь прыходскі збор, таму і захавау грошы.

Музей з'яўляецца базай для практычных заняткаў студэнтаў гістарычнага факультэта. Наведваюць яго таксама студэнты іншых вну, школьнікі.

Вельмі часта наведваюць музей замежныя госці. Аб гэтым сведчыць кніга водгукаў, у якой шмат запісаў на балгарскай, чэшскай, польскай, нямецкай, румынскай, англійскай, в'етнамскай і іншых мовах. Рэдка у якой вну Еўропы ёсць такая вучэбная база для гісторыкаў.

Падзякі, падзякі, падзякі... Ад наведвальнікаў, рэктарата, Міністэрства вышэйшай адукацыі БССР і іншыя.

Работнікі музея у гэтыя дні рыхтуюцца дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна. Арганізавана выстаўка фотаздымкаў, якія асвятляюць дзіцячыя і школьныя гады Ільіча. Выстаўка пастаянна папаўняецца новымі матэрыяламі.

А. ЛАМЕКА,
Л. ПЕРАСЫПКІНА,
студэнткі.

МАРОЗ І СОНЦА. Фотаэцюд студэнта фізфака Г. Пучкова.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 349. АТ 22042.